# Між балтыйскім і мінскім

**Адным з мерапрыемстваў XXVII Мінскай міжнароднай кніжнай выстаўкі стала адкрыццё часовай экспазіцыі «Прастора эстонскай кнігі» ў Нацыянальнай бібліятэцы. Арганізавана мерапрыемства з дапамогай Саюза кнігавыдаўцоў Эстоніі і Нацыянальнай бібліятэкі гэтай краіны.**

Аснову экспазіцыі склалі выданні-фіналісты конкурсу на званне самага высокамастацкага выдання за 2017 год: было адабрана 25 найлепшых кніг, якія выклікалі найвышэйшую адзнаку прафесіяналаў і чытачоў як з паліграфічнага, так і з эстэтычнага пункту гледжання.

Значная частка выстаўкі склалася з кніг выдавецтваў «*KPD*» і «*Aleksandra*», дзякуючы якім рускамоўная публіка ў Эстоніі і за мяжой можа азнаёміцца з навінкамі эстонскай літаратуры. Частка экспазіцыі прысвечана літаратурна-мастацкаму часопісу «Таллин», які ў 2018 годзе адзначыў 40-годдзе з дня заснавання. У адкрыцці ўзялі ўдзел галоўны рэдактар часопіса «Таллин» і дырэктар выдавецтва «*Aleksandra*» Нэлі Абашын-Мельц, а таксама дырэктар выдавецтва «*KPD*» Валянціна Кашына.

Нэлі Абашын-Мельц выказала добрыя словы ў адрас тых, хто робіць магчымымі выстаўкі, кшталту гэтай:

— Эстонскі народ — гэта малы народ, беларуская мова таксама не вельмі распаўсюджана, але мы можам камунікаваць паміж сабой, знаць адзін аднаго менавіта праз працу перакладчыкаў. Акрамя таго, мы дзякуем за тое, што Нацыянальная бібліятэка знайшла ў сваіх фондах кнігі, якія былі перакладзены з эстонскай мовы на беларускую.

Тэму сувязяў паміж народамі падхапіла Валянціна Кашына:

— Не ўсе выданні зацягвае віртуальная прастора, многія застаюцца з папяровай кнігай, але самае галоўнае, што ўсіх нас з вамі аб'ядноўвае — Слова. У Эстоніі вельмі цікава жыць з кнігай, працаваць з ёй, існаваць у выдавецкім працэсе, і як вынік — гэта міжнародны плацдарм, дзе кніга або становіцца канкурэнтаздольнай, або не.

Выстаўка «Прастора эстонскай кнігі» ладзіцца пры падтрымцы выдавецтваў «*KPD*» і «*Aleksandra*», часопіса «Таллин», Нацыянальнай бібліятэкі Эстоніі, Саюза кнігавыдаўцоў Эстоніі, Пасольства Эстоніі ў Рэспубліцы Беларусь. Наведаць яе можна да 15 сакавіка ў Нацыянальнай бібліятэцы.

**Данііл ЛЫСЕНКА**